Ба 239 449

ХВЕДАР ІЛЬЯШЭВІЧ

# ЗОРНЫМ ШЛЯХАМ

[illegible]
16

ас
10909
Ба 239449

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

1964 г.

# ЗОРНЫМ ШЛЯХАМ

239449
Бел. 2005

ВІЛЬНЯ — — — — — 1932 Г.

Друнарня Я. ЛЕВІНА, Вільня, Нямецная вул. № 22.

0 0. 11 3. 2010

НОВАЯ БЕЛАРУСЬ

* * *

Пасьвячаецца маладым песьняром.

За творчасьці варштатам —
Вагністы, бурны ўзьлёт.
Рукой сваёй заўзятай
Хапай парываў лёт!
Мы дружна будзем дзьмухаць,
Каб выйшаў гучны тон,
І песьняй — весялухай
Зазвонім на загон...
Пагляньце — колькі сьвету!
Як зьзяе даль палёў!..
Ідзём да свае мэты
З напевам кавалёў!
Нам песьні звонка скропляць
Вясеньнія дажджы...
Запалу пэўне хопіць
Да сонца дабрысьці...
За творчасьці варштатам —
Вагністы, бурны ўзьлёт.
Рукой сваёй заўзятай
Хапай парываў лёт!

1929.

* * *

Годзе песьні пяяць аб нудзе!
Сэрца бунтам б'е у кажух...
Па краіне ідзе — гудзе
Весназвонны, магутны рух...
Песьня!
Песьня бунтарна — гулкая!
Вырвіся з бледых, спрагненых губ...
Грымні па бруку... вулкамі
Гулам тысячных труб!

1929.


[redacted]

* * *

У баявы марш мы выйшлі. Ідзем па вялікай, адвечнай дарозе гісторыі. Часта, зазыўка, грымуча пяе наш ход. Калісьці паўсталі мы з далёкае, дымнае крыві. Цяпер мы йдзем. Бура, запал—гэта мы! гэта мы! Кожны крок пяе ў нашым сэрцы напеўнай перамогай. Наперад! Наперад! Мы ўзьняліся па зову прапрадзедаўскай крыві й вітаем далёкую дарогу. За намі — цемра вякоў. Прад намі— сонечныя шляхі. Кожны крок дрыжыць у нашым сэрцы. Далей! Далей! — кліча рытм нашага ходу. Хто слабы, хто нядужы—набярыся сілы з крыніцы нашага запалу. А загінуў— ня жаль. Шлях праходзілі мы. Вясеньнія песьні, як птушкі. Мільённы крок. Мы творым, мы творым новую Беларусь! Нас многа, нас многа! У баявы марш мы выйшлі. З загледжаным зрокам, з творчаю дрожжу ў руках — мы творым, мы йдзем. Ветры, сонца, дождж нам спрыяюць. Часта, зазыўка, грымуча пяе наш ход. Наперад! Наперад! Далей!

Хмары чорныя зьвісьлі над намі —
Яшчэ ўчора гучэў Веснаход...
Гэй, сябры! Сьмела ў бой з пярунамі!
Ўспыхне заўтра іншы ўсход!

Гэты цень, што спусьціўся ад хмараў,
Згіне з першай касуляй сьвятла!
І асьвецяцца нашыя твары
Сонцазьзяньнем чароўнага дня.

1929.

Як толькі у сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Успомню я Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях...

М Багдановіч.

Я не баюсь за Беларусь:
Яна, працоўная, прачнулась—
І песьні радасьці цьвітуць
Ад Адраджэньня шуму-гулу...

У пушчах нехта грукаціць,
У вёсках, местах — палымніста...
І па палёх ідзе, зьвініць
Дзён новых весьнік — Веснавіста.

Ударым радасна ў трызвон:
Ніхто, ніхто ўжо нас ня зможа!
З вякоў няволі, стогну, сноў
Ўстае магутна Перамога.

1928.

* * *

Беларусь ты мая рассьпяваная!
(Нібы ў песьнях ты толькі і ёсьць...)
Я прыходжу к табе, о, каханая,
Сын вясны, нібы новы госьць...

Нашы песьні — ня песьні: смутніцы —
Сьмела выкіну я цераз плот;
Клічам тым, як вясной навальніцы,
Прывітаю я бедны народ...

Беларусь! Прыбірайся у краскі,
Ў песьні бурнай і гучнай вясны!
Мы збудуем цябе, як у казцы,
Сьветлай, яснай, як нашыя сны!...

# МЕСТА ВАГНЯВОКАЕ

* * *

Тысячай сонцаў у шыбах разьліўся заход.
На радыё — дроце...
вароны спраўляюць вячэрню...
Сьвежасьць навейвае вулачны мрок —
Места вячэрняе.
Ў іскрах, што ліжуць блакіт языкамі ракет,
Ў моры людзёў, неўгамонным ніколі...
Чую я нейкі сусьветны прывет —
Вечнае Волі...

1929.

* * *

Вуліцы! Вуліцы! Вуліцы!
Тыя, што давалі мне рытм...
Я хачу сягоньня рашчуліцца,
Бо ўспомніў вас, быццам міт...

Доўга вас ня бачыў замкнёны,
Доўга марыў, марыў я;
Сьнілісь мне шумы і звоны,
Паводка электрычнага сьвятла...

Сягоньня быў шчасьцем abліты я...
Шчасьце — лебядзіны пух...
Бачыў вулкі, калі з паліцыяй
Шоў па бруку, скаваны ў ланцуг.

„Лукішкі“ 1929.

Віяьня.
Рух і шум.
Гудкі і грукат...
Мінуўшчыны, як ня было!
такі узрост!
ці думаў твой прапрадзед,
што па бруку тваім памчацца
песьні паравозу...
Зьзяе Вільля ў электрыкі сьвятле.
Людзкі натоўп і сьціск.
І не на жарты —
Я веру ў тваю будучнасьць,
Цябе калісь абзначаць на географічных картах!

1927.

## У ГАРАДЗКІМ САДЗЕ.

Дрэвы акутаны змрокам...
А неба поўна хмар...
Недзе ў алеі далёка
Мігціць адзінокі ліхтар...
Ціха...
Ціха навокал.
Каб нейкі крык, ці сьмех...
Лісьці нізка й высока
Сыплюцца, нібы сьнег...
Сумна шасьцяць, неахвоча...
Прысьніўся мне ізноў
Іх шопат у сінія ночы
На крыльлях зор — матылёў...
І ў сэрцы засьмяглі кветкі —
І ціха, ціха сьню
Адцьвіўшую няпрыметна
Цудоўную вясну.

1931.

* * *

Лаўлю адрыўкамі разгул мястовы,
Падобны да дыханьня зьвера...
Вагні рэклям цалуюць калярова
Вячорна - веснавую шэрасьць...
Што раз, то новыя знаходжу зьместы
Ў вагнёў разводзьдзі, моры шуму...
Вясьнянка казачная —
Места —
Мая вячорная задума.

1929.

Рассыпалісь іскрынкі — зоры
Ў нябеснай, лядзянай далі...
Цямнеюць, як волаты — горы
І цені ў лагчынах ляглі...

Цяпер гарады загарэлісь —
Нью-Йорк... і Парыж... і Бэрлін...
О, зоры! Ці неба вы веліч?
Ці вы, гэта — водблеск зямлі?..

1930.

## ДЫМНАЕ МЕСТА.

Вечарам мгліста дымяцца вуліцы—
Нехта разьліў у тумане жоўць...
У вочы чаромхай электрыкі жмурыцца
Места гулкае—фасфарачны воўк.
Душна... Душна... Майскімі кветкамі
Ўслалі рэкламы люстраную гладзь...
Ходзім мы брукавымі палеткамі
Вясновага госьця з палёў выглядаць...
Добра вам цяпер, сінявокія вяскоўцы,
Гуляе сьмех на вашых губох...
Глядзіце ў вочы ворагу—воўку...
Вялікі ваш час, жыхары дарог...
Дымяцца...
Дымяцца... вечарам вуліцы—
Як быццам ходзіць нейкая здань—
Рукой махае й да сьценаў туліцца...
Душна... Душна... Страшна нам!

1930.

239449



Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

## МЕСЯЧНАЯ КАЗКА.

Ў пакоі—сетка месячных праменьняў.
Вазоны з кветкамі—на шыбінах узор.
Праз вокны—пацеркі дрыжачых зор...
Я зьнік у казцы ценяў і поўценяў...

Места гарыць у рожавым тумане...
Далёкі шум—хвалі людзкой прыліў...
Покі за комін месяц не заплыў,
Казка цудоўная лунаць не перастане.

1931.

* * *

Насталі цудоўныя ночы —
У сэрцы спакойна ізноў.
І жмурацца вечарам вочы
На сьвет сінядымных вагнёў.

Каб мог, я-б, рукою махнуўшы,
Спыніў места вулачны рух...
У сэрцы—як лебедзь заснуўшы,
Грымуча і гулка наўкруг.

1930.

* * *

Спляліся цені — попел змрокаў
Пасыпаў сосны і кусты...
Ўнізе, над местам вагнявокім,
Пераліваюцца вагні...
За намі лес шуміць напеўна,
А вецер лашчыцца... бунтар...
Як быццам пэрламі князеўна —
Свой запаляе места твар.
Вагні... вагні... і шум мястовы
Зачаравалі нас, бы ў сьне...
Павабна маняць места зовы
Загінуць у людзкой таўпе...
Цямней... цямней... — сьцяною чорнай
Зьліліся сосны і кусты...
А унізе, ярчэй, узорней
Пераліваюцца вагні...

Ліпень, 1930.

## ВОЧЫ МЕСТА.

Калі ймгла разгорне свае крыльлі
І атуліць вуліцаў далеч...
Загараюцца на цёмным небасхіле
Твае вочы тысячамі сьвеч...

Ў тратуарах — люстрах — зьліткі ценяў...
І зіхцяць д'ямэнты воску-сьлёз...
Ў твае вочы лятуценна і маленна
Я заглядзеўся, шукаючы свой лёс...

Заклікае радыё на спацэр,
А у сэрцы — радасная ціш...
Ты-ж вачыма — мірыядам пацерак —
У тамане рожавым гарыш...

1930.

## ЦЯГНІКІ.

Рэйкі — жылы...
Крывёй чорнай заплылі.
Паміж поля, як гадзюкі, папаўзьлі у даль.
Перапеўна - пудка сталь
Разьзьвінелася ў начную ціш...
Не шамраць — замоўклі — каласы...
Зорамі усыпаная выш...
Толькі з цемры,
Нібы з неба проста ўніз,
Мчацца, мчацца вогненныя цягнікі.
Я, заслуханы у дальні бег,
Замёр сярод жытоў...
Ці ісьці далей, ці ня ісьці?
Цягнікі нясуцца зноў і зноў,
Выпушчаюць пудкіх ластавак у поле —
Места шум...
Нібы стрэлачнік, начую ў полі я,
А ў вачох іскрыста, поўнае вагня —
Сьніцца места, сьніцца места мне...

1931.

* * *

Колькі раз я пяяў вам, дажджы?
Колькі раз на вясьнянай вуліцы
Мы скакалі вакол, кружачы
У вясёлай, завейнай разгульліцы?
Зноў абмыліся дахі, дамы,
Сінь нябёсаў фарбуе шыбіны
І ў чаруючы захад мы
З нейкай думкай прыгожай заглыблены.
І як змрокі сплятаюць цем,
Паміж комінаў месяц блукаецца,
У вясьняную п'яную дрэм
Глуха места шуміць, разьліваецца.

1929.

* * *

Гарады, гарады Беларусі —
Заіскрыцеся ў вершы ізноў...
Мы вяслуем у мглістай задусе
Да блакітных Тваіх берагоў...
Неба зрэзана — быццам паперка,
Дахі ў неба растуць наўкруг. —
У вачох калышуцца мерна
Электычныя зоры й рух...
Кірмашы — перапевы вуліц
Льлюць у сэрца хмельны гам...
У паветры на ноч заснулі
Шматкалёрныя цені лямп...
Вастравы — вагнявокія месты —
А навокал імглістая даль. —
Сьпеў наш ціхі, далёкі — плывеш ты
І калышашся сярод хваль...

1932.

Валакуся ўтомлены, зморany...
Поўны сонца — зіхціць тратуар...
Разьліваецца шум на ўсе стораны...
А ад сонца у тварах — пажар.

З людзкой хваляй брыду...
Заварожаны і заслуханы ў родны мне рытм.
Можа думкам маім устрывожаным
Дасьць адказ тратуарны граніт?..
Ці ня здорыш ты сына вясновага,
Места любае, славай таей, —
Як бязслаўна пад дахам мястовым
Памірае цяпер салавей...

# БЕЗЬБЯРЭЖЖЫ КАЛАСЬСЯНЫЯ

## СЯЛЯНСКАЯ ДОЛЯ.

Ты мужык, цёмны люд,
Ні пісаць, ні чытаць ты ня ўмееш,
Век свой косіш, гарэш,
Для чужых толькі жнеш ты ды сееш...
Школы ёсьць для паноў,
Не для вашых няшчасьлівых дзетак,
Бо за школу плаціць
Ты ня маеш грашэй увек векаў,
А ты сам мужычок
Сей, гары ды касі, потам зьліты,
Век свой будзь турдзячок
І працуй увесь пылам акрыт
Ні скаціны ў сябе,
Ні кала на дварэ ты ня маеш!
Ні збажынкі ў гумне
Вось і доля табе, долю маеш!
На руках мазалі,
На нагах лапаці абарваны —
Сей, гары ды касі,
Цяжкі працы знасі, ты, загнаны.

1921.

* * *

Дзіця мястовых песьняў гулкіх,
Я часам, змораны, пакіну
І шум і цесныя завулкі —
Адходжу ў мілую пустыню...
Гэй, поле!—ў песьнях, з красак зьвітых,
І з тэлеграфнымі стаўбамі, —
Люблю купацца я у жыце,
Што мне сьмяецца васількамі...
У тэлеграфным аднатоньні
Я чую не дэпэшы волю,
А быццам тон журбы таёмнай...

Чаго задумалась ты поле?
Ці ты тужыш таму, што тэхніка
Выходзе з места к табе ў сваты
Й нясьмела тулішся да стрэхаў
Раскіданых сялянскіх хатаў?..

1927.

* * *

Сонца гразьне ў чырвоны кісель...
Каласьсяна залацяцца гоні.
На узьлесьсях пасела імглістая бель,
Быццам стада белагрывых коняў...
З-за вазёр, з сінядымнага краю,
Прыляцела вячэрная бая.
Нехта ў полі далёка пяе,
Воз мой песьні таей падпявае...

1929.

## ГАРМОНЬ ВЯСКОВАЯ.

Залівaецца пераборыста.
Рассыпаецца дробна —
дробненька,
Захлынаецца смутна —
смутненька.

То расходзіста, няўстрымана
Зашыбае яна радасьць
буйную,
Радасьць буйную,
маладзецкую.

То ізноў ціха — ціхенька
Плача голасам
Смутна — смутненька
Гармонь вясковая.

1929. Пружаны

* * *

З кута на хату вышчарылась
Печка, як чорны кот...
На сьценках мухі рояцца,
Як бы на нейкі сход...

А побач у парадачку
Вартуюць рагачы...
Хтось стогнучы — гаворачы
Разьлёгся на пячы.

Праз вокны зачарнелыя
Ўрываецца вясна...
Чарпаюцца ў шыбіны
Праменьчыкі сьвятла...

У садзе сьвішча, чохкае
Вясёлы салавей...
На печцы нехта вохкае
І стогне ўсё мацней...

1929 Пружаны.

* * *

Ноч прыйшла туманная,
Ня чутно ўжо гулу...
Казкаю вясьнянаю
Беларусь заснула...
Зоркі ткуць ёй хораша
Узоры чароўныя,
Ходзіць месяц сторажам
Над ёю, князёўнаю.
Скачуць і сьпяваюць
Русалкі прыгожыя...
Дрэмле ля ручая
Лясун заварожаны...
Серабрацць між соснамі
Просьветы цудоўныя...
Сьпіць у царсьтве сосьненым
Беларусь працоўная.

1930.

## ЖАДАНЬНЕ.

Беларусь! — краіна Сіняя...
Я люблю Цябе да сьлёз...
Вандраваць тваймі пуцінамі
Мне прызначыў пэўне лёс.

А ці можа быць што лепшае,—
Слухаць песьні каласоў,
Гаманіць з сінявым вечарам,
Прытуліўшысь ля стагоў;

І маліцца па дзіцячаму
Той журбуючай цішы,
Што навейвае жабрачыя
Думкі — казкі у душы?..

1928 г.

* * *

Даўгая, вастрожная ноч,
Здаецца яна без канца
І думак ня ў моч перамоч —
Наўкол цішыня, цішыня...
Прысьнілась мне вёска, рад хат...
Як змучаны працай цяжкой
Я соладка піў арамат
Прасторных, радзімых палёў.
Над грэбляй (на сьхіле нябёс)
Чароўная зорка ўзыйшла...
Скрыпеў запазьніўшыся воз...
Усюды зьвінела журба...
Цяпер у вастрозе, бяз сіл,
Я ўспомніў мінулыя дні
І ў сэрцы бунтарскі прыліў
Мне думку падаў аб жыцьці...

Лукішкі 22/VI 28.

## ВЯСКОВАЯ ІДЫЛІЯ.

Прапялі вазы на дарогах.
Серабрыць даль палёў
сярпок—месяц.
Каля плоту на месяца рогі,
Як на злодзея, сабакі брэшуць.
Вёска сьпіць ў серабрыстай
сарочцы,
Толькі ў хатцы, ля самага гаю,
Ваганёк паласіць на
дарожцы...
І туды я, чамусьці, сьпяшаю.
Прытаіўшыся моўчкі, я бачу,
Як ад печкі залоцяцца
сьцены...
У куце сядзіць дзеўчынка й
плача
(Ў лесе тояцца пострахі-цені).
За сталом хлопчык дрэмле,
чакае,
Покі маці згатуе вячэру...
І я чую, як боршч закіпае,
Як чарапае кот каля дзьвераў...

. . . . . . . . . . . . . . .

У хаце ціха. Ляглі усе спаці.
У ваконцы глядзіць ягнё —
месяц.
Печку белую, бы сваю маці,
Языком — паласой ліжа,
цешыць.

1929. Пружана.

* * *

У бярэзьніку — зялёнцы
Зашумелася вальней...
У кустох, аблітых сонцам,
Зноў зачохкаў салавей...

Зноў я нечага жадаю,
Зноў я нечага томлюсь...
Мо' з вішнёвым цьветабаем
Цалаваць маці — зямлю?..

* * *

Салодкі шум грымячых шын..
Навокал поле, поле...
Пяюць калесы гулкі гімн
Аб каласьсянай волі...

Яшчэ кіпіць у жылах кроў
І вабяць сэрца далі...
Нясі, цягнік, без астаноў
Мяне ўсё далей, далей....

# ПЕСЬНІ КАХАНЬНЯ

* * *

Песьні каханьня, вы — птушкі,
Ляціце да мілай маей...
Пасядзьце ўвяночак — істужкай
Над сьветлай яе галавой...

Загляньце, ці чыстыя вочы
Сінеюць прасторам нябёс?
Ці шэмрам калосьсяў шапочуць
Зьвіткі яе хваляў — валос?

Бо вобраз твой сьніць няма сілаў,
А сэрца мне смутак спавіў...
Ляціце-ж, ганцы, к маей мілай
Абшарам разлогаў і ніў...

* * *

Сягоньня я хворы,—
Ня бачыў цябе я...
А месяц учора
Сьвяціў, як лілея...
Вясеньнія дрэвы
Вакол калыхаліся...
Ў кустох перапевы
Цьвілі, расплываліся....
Я цэлую ночку
Ня спаў—лятуцеў—
І мроілась ў воччу
Напеўнасьць дзярэў....
Сягоньня я хворы—
Тужлівы, натхнёны
І ціхі, як зоры —
Я хворы сягоньня....

1930.

* * *

Плакаў дожджык ноччу,
Біўся ў вокны лісьцем...
Сэрца чагось хоча,
Як даўней, калісьці...

Ў дрэме неспакойнай
Мрою аб дзяўчыне...
Цені у пакоі
Сплялі павучыньне...

Ценяў сон вясеньні —
Матыль лёгкакрылы...
Плывуць лятуценьні
З дальніх небасхілаў...

1931.

* * *

Беласьнежным, сьвежым цьветам
Вішні ў садзе расьцьвілі...
Ах, цудоўна перад летам
На прабуджанай зямлі...

У вачох тваіх, каханая,
Заіскрылася цяпло...
З новай верай, быццам п'янае,
Сэрца біцца пачало.

1930.

* * *

Сьмягнуць нашы целы
Ў век бэнзыну й рэклям.
Пайшоў-бы на востраў белы —
Ды дымна, пэўне, й там!

Давай — замкнемся ў хаце —
Забудзем аб усім...
І што нам будзе значыць
Рэкляма і бэнзын?!

1930.

* * *

Места, места — любы ворагг —
Пэўне ты мяне псуеш,
Бо ня дальш, як ад учора,
Зьненавідзеў я сябе-ж...
Ў затуманеных алеях
Я засмучаны хадзіў...
Месяц белы, як лілея,
Серабро на лісьце ліў...
Прада мною чарадою
Шмат хадзіла весялух,
Сьмех зьвінеў вясьнянай мрояй,
Разыходзіўся наўкруг...
І яна сьмяялась разам —
Доўга чуўся мне той сьмех.,.
І цяпер ў вушшу адразу
Ён гучыць, як-бы на грэх...

1930.

* * *

Серабрысты месяц...
Ціхі сон кустоў...
Сэрца песьняй цешаць
Салаў'і ізноў.
Ўжо засьмяглі лісьці
Ад пары таей,
Як пяяў калісьці
Так-жа салавей...
Разнясло вятрамі
Лісьце на палёх
І даўно між намі
Згасла пачуцьцё...
А па сэрца струнам
Перазвонна б'е
Успамінаў руньню
Салаў'іны сьпеў...

1931.

* * *

Шум на вуліцах, неба, людзі
І усё, усё, што я бачу,
Што я чую сягоньня ўсюды —
Так прыгожы, так мнагазначны...

Ў маё сэрца сягоньня радасьць,
Нібы ластаўка, прыляцела —
Кожны бліск вачэй спагадных
Выклікае бадзёрасьць і сьмеласьць..

Ці таму, што па бруку дажджамі
Гукі рад'я сыплюцца, льлюцца
Й прадаваныя кветкі ў брамах
Гэтак цёпла вясною сьмяюцца?

1931.

# НАПЕВЫ І ДУМЫ

* * *

Здавалась, у зімовым сьне
Засьмяглі краскі пачуцьця...
Ды... лятуценьнем аб вясьне
Заваружыў іх, пэўне я.

Сягоньня шумнаю дзьвіной
Вясеньні пеніцца напеў
І мой узвышаны настрой
К сонцу фэйэрвэркам узьляцеў

Я знаю—у спакоі вод
Магутна дрэмлюць бураны...
Ускалыхне іх ветру лёт
І сьвежай бурай мкнуць яны.

* * *

Зямля каханая!
Ты чуеш, як я цябе люблю.
Ты—ўсё! Я—твой пясьняр...
Песьні вясьняныя!
Вас сонцам шчодра абальлю,
Кіну зямлі, як дар...
Радасьць жаданая!
Абвей з канца ў канец зямлю,
Хваляй вясны удар!

1931.

# У КУЗЬНІ.

Рукі самлелі ад молата.
Потам заліўся ўвесь твар.
Ў горан падсыплем мы золата—
Зробім мы працы пажар.

Ў горне зьмяістымі бліскамі
Цудныя краскі цьвітуць...
Твар наш цалуючы іскрамі,
Новых нам сіл дадаюць.

Ў сталь пакладаем душу мы—
Сталь запяе ў жывы тон...
Моцна яе разбушуем,
Зробім ліхі перазвон.

Ў кузьні мы песьні сьпяваем...
Грудзі працоўныя ўвысь!
Кузьня зьвініць, як жывая —
Мы кавалі — сьцеражысь!

Рукі самлелі ад молата...
Ўдар здаганяе удар...
Ў горан падсыплем мы золата,
Ўзьнімем мы працы пажар.

Пружаны, 1929.

* * *

Паверце, я яшчэ вельмі наіўны —
Ня прывучыў быць сабакам сэрца —
І часта пытаю сябе і зьдзіўленых:
Чаму мы жывем у такой паняверцы?

Мы-б маглі усе, усе без жарэбія
Жыць панамі на прыгожай зямлі...
Пяяць песьні аб смачным хлебе
І тварыць дальнаплыўкія караблі...

1930.

* * *

Вагні ярчэйшыя...
Вясеньні веў...
Гальштук сьвятлейшы я
Сягоньня ўзьдзеў...

Настроі ціхія,
Як нейкі сьпеў...
Здаецца ў міг-бы я
Так занямеў.

Іду... валандаюсь
У ценях дрэў...
Сёньня-б я рандэ-ву
З усімі меў...

Вільня 1931.

## МУЗЫКА.

Ўзьняліся лёгкакрылыя птушкі... шыбаюць у высь... над сонечным полем...
Зазьвінелі...
Залацяцца іх крыльлі пад сонцам... у сінім, крыштальным прасторы... далёка... далёка... зьвіняць...
Узьляцелі палахлівымі ўзмахамі... пудкія, шыбкія птушкі...

---

Дрэмле маліцьвенна лес...
Пявуча-салодка шумяць сосны...
Праз вецьце залацяцца зоры... мігцяць...
Ціха, ціха праз сон шапацяць хвоі...
Шум баравы...
У возеры—люстры купаецца месяц —
Срэбрыста іскрыцца
А зоры пылаюць... пылаюць... дрыжаць... заміраюць... мігцяць... Маліцьвенны лес...

---

Чуецца плач у размроеных гуках...
Хапае за сэрца лядзянай рукою...
Вось яна! Сьмерць!
І сумна...
Жаласна скардзяцца струны...
Плачуць, енчаць, галосяць, смуткуюць...
Сусьветны сум...

---

Музыка!
Недзе далёка... бязьмерна далёка...
І молатам б‘е у сэрца кліч — барабан...
Недзе далёка гучыць вясеньні марш... плыве... крапчэ... расьце... аглушаець... вясеньняя хваля імчыць... Грымуча, пераможна льле з гулам шумлівыя, грозныя хвалі... і вясеньняю хваляй льлецца ў сэрца рытм...

1930.

* * *

Дрэвы шапочуць у боскай драмоце,
Зоркі гараць, зачапіўшысь ў галінах,
Пар лёгкаўздымны кадзіць на балоце,
Таюць ў начы ціхасьпеўныя гімны...
Гэта малітвы к прастору — Сусьвету
Ў сьветла-пяшчотным зямлі прабуджэньні...
Быццам крылатыя казкі-прыветы,
Быццам цудоўныя сьпевы-тамленьні...
Слухай... Маўчы...

1927.

## ДАЗОРЦА.

Ён у ночы страляе кашлем,
Марыць позяхам аба сьне
І даўгія гадзіны ўважна
Маўчыць у глухой цішыне.

У яго душа зьліняла
Ад турэмнае жоўці муроў.
Бачыў ён, як з зубоў сьцякала
На каменным цамэньце кроў.

На пратэсты ён паясьняе,
Што ён мае дзяцей і дом
І ля цэлі на 1-га мая
Доўга слухае, слухае ён.

Ў дзень звальненьня неяк цяжка —
Rzeczy zbierać — ледзь не шапне.
Ён у ночы страляе кашлем,
Марыць позяхам аба сьне.

1929.

## СПАЦЭР

Што дзень выходзім на спацэр.
Спацэрны вазон — бяз стрэх.
Навокал сьцены — пракляцьце —
Мы ў іх—жывых красак бег.
Ідзем... Ідзем.

Ці дождж, ці сонца, ці сьнег —
Аб сьцены вочы вострым.
45-мінутны бег.
Дазорца загадывае: odstęp!
Ідзем... Ідзем...

Колькі вёрст? Зьлічыць—ці ўдасца?
Лік загубіўся ў гадох.
Як быццам у нейкай казцы
Даўгі, даўгі шлях пралёг...
Ідзем... Ідзем.

Часам, праз сьцены, з места
Ловім водгук жыцьця:
Тады ў нас дзень бяз зьместу —
Даўгі, даўгі без канца...

1928.

## ГРУГАНЫ.

Ня кружыцеся вораны чорныя,
Вы ня бійце крыльлём у вакно...
Весткі вашыя мо' й верагодныя —
Не паверу я ім ні за што.

Не паверу, што цем безпрасьветная
Будзе вечна акутываць даль...
Прыдзе, прыдзе вясна шумна-сьветлая —
І зьвініць мая песьня, як сталь.

1927.

239449

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

* * *

Час, калі трэба журыцца
Душою на сьвежых магілах
Пуста пранёсшыхся днёў.

М. Багдановіч.

Вучуся холаду у сьцен,
Спакою ў песьнях аб нядолі,
Хачу сьцюдзёна выпіць сэнс
Людзкіх жаданьняў і патолі.

Ў вячэрня-ціхую пару
Зьліваю ў цемру свае зрокі
І быццам слухаюць і мруць
У цэлі жудасныя змрокі.

„Лукішкі“ 1929.

0-30
Бел. 2005
B00000002482630

**Выданьне**
**„Беларускага Выдавецкага Т-ва ў Вільні“.**